Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ

ОРГАН ОСВЕЙСКАГА РК КП[б]Б і СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

4044:7.7

№36[48] ПАНЯДЗЕЛАК 26 ЛЮТАГА Цана 15 кап. № 36[48]

КІРАЎНІКІ КАЛГАСАЎ, СЕЛЬСОВЕТАЎ ПАВІННЫ ШТОДЗЁННА КІРАВАЦЬ БУДАЎНІЦТВАМ. ТРЭБА СКАРЫСТОЎВАЦЬ УСЮ РАБОЧУЮ СІЛУ НА БУДАЎНІЦТВЕ, КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ВЫКАНАННЕ ПЛАНА БУДАЎНІЦТВА ДАМОЎ КАЛГАСНІКАМ.

## Выканаць план будаўніцтва дамоў калгаснікам

Будаўніцтва дамоў калгаснікам, аднаўленне калгасных вёсак, зараз галоўная задача ўсіх калгаснікаў, кіраўнікоў калгасаў і сельсоветаў. Гэтаму пытанню ўдзяляе вялікую ўвагу партыя і ўрад. Партыя і ўрад клапоцяцца, каб хутчэй аднавіць калгасныя вёскі, якія разбурылі і спалілі нямецка-фашысцкія захопнікі, каб кожны калгаснік, рабочы і служачы жыў у светлай і цёплай хаце. Для гэтай справы ўрадам адпушчаны вялікія і доўгатэрміновыя крэдыты. Кожнаму калгасніку на пабудову дома адпускаецца крэдыт у 10 тысяч рублёў. Будаўнічая брыгада за кожны пабудаваны стандартны зруб атрымлівае ад 3300 да 4100 рублёў.

Створаныя па калгасах будаўнічыя брыгады, работаюць на будаўніцтве каля двух месяцаў. Кожнай будаўнічай брыгадзе даведзен план будаўніцтва і графік будаўнічых работ. Але гэты план і графік работ брыгадамі не выконваецца. Прычына таму, што на будаўніцтве не скарыстоўваецца поўнасцю ўся рабочая сіла. У некаторых калгасах замест 3-4-х будаўнічых брыгад арганізавана адна, астатнія калгаснікі сядзяць дома, асабліва як рахункаводы, брыгадзіры, жывёлаводы і другія. Рэдка бываюць на будаўніцтве і старшыні некаторых калгасаў. У калгасе „Шлях Камунізма" замест плана 6 пабудавана толькі 1 зруб. Дрэнная справа з будаўніцтвам у калгасе „Ударнік" [старшыня тав. Марынскі] дзве брыгады за ўвесь час замест планавых 9 зрубаў пабудавалі толькі адзін. Старшыні гэтых калгасаў не кіруюць будаўніцтвам. Яны рэдка калі бываюць ў будаўнічых брыгадах, і такзама не арганізавалі і не паслалі на будаўніцтва ўсіх калгаснікаў, якія павінны будаваць.

Згодна апошняга ўказання абкома КП[б]Б і Райвыканкома ў некаторых калгасах значна палепшала работа на будаўніцтве. У калгасе „Чырвоны Пахар" [старшыня тав. Казнякоў] будаўнічая брыгада ў ліку 6 чалавек за два тыдні пабудавалі два зрубы. Добра работае будаўнічая брыгада ў калгасе „Серп і Молат" [брыгадзір тав. Макеснак] за апошнія дні яны заканчваюць другі зруб. Добра работаюць будаўнічыя брыгады ў калгасах Малашкаўскага сельсовета. Але і тут значная частка калгаснікаў не ўдзельнічае ў будаўніцтве.

Кіраўнікі калгасаў сельсоветаў павінны штодзённа кіраваць будаўніцтвам. Трэба скарыстоўваць усю рабочую сілу на будаўніцтве каб забяспечыць выкананне плана будаўніцтва дамоў калгаснікам.

## Становішча у Берліне

ЛОНДАН, 14 лютага. [ТАСС]. Як паведамляе шведская газета „Афтонбладэт" у Берліне пануюць голад і паніка. 11 лютага гітлераўцы вымушаны былі выставіць ля харчовых магазінаў узброеную ахову.

### ЧУТКІ АБ ПЕРАНЯСЕННІ ГЕРМАНСКАЙ СТАЛІЦЫ

ЛОНДАН, 11 лютага. [ТАСС]. Як перадае англійскае міністэрства інфармацыі, паведамлях, атрыманых з непрыяцельскіх крыніц, з 3-га лютага сталіца Германіі перанесена ў Нюрнберг.

### МЕРАПРЫЕМСТВЫ ЧАСОВАГА ВЕНГЕРСКАГА ЎРАДА

ДЭБРЭЦЭН, 11 лютага. [ТАСС]. Гітлераўцы, адступаючы з Будапешта, вывезлі або знішчылі ўсе харчовыя запасы, пазбавіўшы насельніцтва сталіцы прадуктаў харчавання. Зараз часовы ўрад Венгрыі прымае рад мер па аказанню дапамогі галадаючым жыхарам Будапешта. У сталіцу ўжо накіравана больш 100 вагонаў прадуктаў.

Паведамляючы аб гэтым, венгерскі друк падкрэслівае велізарную ролю савецкага камандавання ў ліквідацыі вынікаў грабежніцкага гаспадарання немцаў і іх прыспешнікаў з „ўрада" Салашы.

## Уключыліся ў соцспаборніцтва

Рабочыя і служащчыя Кахановіцкай МТС уключыліся ў соцспаборніцтва. Яны ўзялі на сябе абавязкі сабраць у першай палове лютага адзін трафейны трактар. Загадчык майстэрні тав. Гардзей, трактарысты Гліцкі, Манько і другія свае абавязкі выканалі. Да 16 лютага яны сабралі і адрамантавалі адзін трафейны трактар. Перавыконвае свае абавязкі і кузнечны цэх. Каваль Зерамей выконвае норму выпрацоўкі на 130 процантаў. Перавыконвае нормы выпрацоўкі і будаўнічая брыгада.

Афанасьеў.

## Шырэй разгорнем будаўніцтва дамоў

После вызвалення нашага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, наша калгаснае сялянства ўзялося за пабудову сваей вёскі. Калгаснікі Малашкаўскага сельсовета калгаса „Чырвочая Залучча" уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва, за [illegible] пабудавалі 3 зрубы. К канцу гэтага месяца яны ўзялі на сябе абавязак пабудаваць яшчэ 2 зрубы. Добра работаюць на будаўніцтве брыгады брыгадзірамі якіх т. Бароха Ц. і Гігель Фёдар, яны стараюцца каб хутчэй аднавіць сваю разбураную вёску, выканаць узятыя на сябе абавязкі.

Сакратар сельсовета КУРАШ.

## Гутаркі праходзяць ажыўлённа

У калгасе імя „Крупскай" добра наладжана палітычна-масавая работа. Агітатарам тут работае старшыня калгаса тав. Аржанік. Ён заўсёды прыходзіць к калгаснікам са свежымі газетамі і зводкамі. Калгаснікі з павагай сустракаюць свайго агітатара. Начынаецца гутарка. Тав. Аржанік чытае і растлумачвае калгаснікам зводкі совінформбюро і артыкулы з газет. Калгаснікі з вялікай увагай слухаюць яго, а потым задаюць яму пытанні і атрымліваюць здавальняючыя адказы. Гутаркі праходзяць ажыўлёна. Тав. Аржанік на занятк і заўсёды прыходзіць падрыхтаваўшыся.

К. М.

### ПАРАДЫ АГРАНОМА

## Высокая якасць пасяўных фондаў залог ураджаю

Адзіным з асноўных мерапрыёмстваў у барацьбе за высокі ўраджай, гэта падрыхтоўка пасяўных фондаў, забяспячэнне ўсей плошчы пасева насеннем высокіх пасяўных якасцей.

У умовах нашага раёна, дзе на працягу 3-х год нямецкай акупацыі, зямля не абрабатывалася, угнаенне не уносілася у глебу, падрыхтоўка насенных фондаў заўляецца яшчэ большай важнасцю.

Бароцца з неспрыяючымі ўмовамі, выйсці пераможцам у барацьбе, даць многалікія натомеры [высокі ўраджай] здольна толькі здаровы арганізм расліны, а здаровы арганізм можа развівацца толькі з паўнацэннага насення, з высокім запасам спажыўных рэчаў, з добрай усхожасцю.

Бароцца за жыццё кожная культурная расліна будзе паспяхова тады, калі вывод яго будзе менш пустазелля. Добраякаснае зярно дае дружныя ўсходы, якія паспяхова развіваюцца і паспяхова вядуць барацьбу з пустазеллем. Недарма кажа народная прыказка, „Ад дрэннага насення не чакай добрага племя". Таму трэба дабівацца каб насенны фонд быў высокай якасці.

Першачарговая работа з насеннем, гэта ачыстка яго ад пустазелля і хілых мала развітых, маложыццёвых зярняў і прымясі другіх культур. Трэба зрабіць насенны фонд аднародным адборным зярном.

Але і здаровае зярно не якасным захоўваннем ў сырым памяшканні можа давясці да непрыгоднасці. Зярно трэба захоўваць у сухім чыстым памяшканні.

У кожнай культурнай расліны ёсць свае шкоднікі і хваробы. Барацьба з імі не цяжкая, але неабходна ведаць ступень заражэння зярна, каб своечасова падрыхтавацца да барацьбы.

У барацьбе за высокі ўраджай у зямельнай сістэме ёсць кантральна-насенная лабараторыя, якая правярае якасць насенных фондаў. Усё насенне павінна прайсці праверку ў кантральна-насеннай лабараторыі не менш 2 разы, каб ведаць яго пасадачную годнасць.

Старшыні калгасаў, брыгадзіры, звеньявыя і аграномы, на вас ляжыць адказнасць за якасць падрыхтоўкі і захоўванне насення. Забяспечым хутчэйшую ачыстку насення, і якаснае захоўванне яго, каб засеяць нашы соцыялістычныя палі добраякасным зярном.

аграном райза НЕМЧЭНКА.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР Е. В. ЛУКАШЭНКА.

Адрас рэдакцыі газеты „Л. Ш." Освея Садовая. Тыраж 1000 экз.